ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ___ Г.У. Шугала

**ПЛАН РАБОТЫ ДЗІЦЯЧАГА ЧАСОВАГА АБ'ЯДНАННЯ – ЛАГЕРА "ЗДАРАВЯЧОК" З 01.11.2019 г. ПА 08.11. 2019 г. (6 каляндарных дзён).**
**ДУА "ТУРЭЦКІ ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫ КОМПЛЕКС ДЗІЦЯЧЫ САД-СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА"**

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення адукацыі
Карэліцкага райвыканкама
_______ І.В. Асташэвіч

## Раздзел 1. Вынікі работы прышкольнага лагера “Здаравячок”, які працаваў на базе ДУА “Турэцкі ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа” з 29.10. па 06.11.2019 г.

(дасягненні, выкананне педагагічных задач, праграмы змены, якасны аналіз складу атрада, педагагічныя вывады)

**Мэта:** стварэнне ўмоў для актыўнага адпачынку, пры якім вучні будуць не толькі адпачываць, аздараўляцца, але і займацца самаразвіццём праз фарміраванне ведаў аб вядзенні здаровага ладу жыцця, аб развіцці ў сабе імкнення фарміраваць найбольш значымыя якасці сацыяльна актыўнай асобы.

**Задачы:**

-фарміраванне духоўна-маральных каштоўнасцей, навыкаў здаровага ладу жыцця ў дзяцей;

- грамадзянска-патрыятычнае выхаванне;
- актыўнае прыцягненне дзяцей ў сацыяльна-значымую і культурна-досугавую дзейнасць;

-фарміраванне навыкаў самадысцыпліны;

- прафілактыка супрацьпраўных паводзін.

**Узровень сфарміраванасці калектыву**.

У часова сфарміраваным дзіцячым калектыве было 8 хлопчыкаў і 7 дзяўчынак (15 навучэнцаў ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў). Усе рабяты знаёмыя паміж сабой з часу прыходу ў школу, таму складанасцей пры фарміраванні калектыву не ўзнікла. Імпульсіўнасць і рэактыўнасць паводзін, як галоўныя якасці характару малодшых школьнікаў, асабліва ярка праяўляліся пры правядзенні масавых спартыўных гульняў, выкананні творчых заданняў. У цэлым у часова сфарміраваным калектыве прысутнічаў жыццярадасны, бадзёры настрой. Жывасць і непасрэднасць вучняў давала магчымасць выхавацелям хутка выяўляць іх індывідуальныя асаблівасці, характар. Узаемадапамога, добразычлівасць, узаемапавага асабліва праяўляліся пры правядзенні калектыўных мерапрыемстваў, спартландый, конкурсаў. Вынікі даследавання паказалі, што станоўчы эмацыянальна-псіхалагічны клімат, добразычлівыя адносіны, задавальненне зносінамі з’яўляюцца асноўнымі характэрнымі рысамі данага дзіцячага калектыву, дзе прысутнічалі сяброўскія пары, выдзяляліся лідэры. Каафіцыент згуртаванасці сярэдні. 35% вучняў з’яўляліся лідэрамі ў структуры міжасабовых зносін у гульнёвай дзейнасці; адсутнічалі вучні, якія выпалі з сферы міжасабовых зносін у калектыве (ізаляваныя). У атрадзе не было дзяцей, якія патрабавалі б асаблівай педагагічнай увагі. **Рэалізацыя праграмы змены**. Накірунак работы лагера быў выбраны як спартыўна-аздараўленчы, так як фарміраванне здаровага ладу жыцця – важнейшая частка выхаваўчай работы па захаванню і замацаванню фізічнага, псіхічнага, маральнага здароўя дзяцей. Кожны дзень меў сваю назву:

“Узнёслае царства казкі і дабра”, Падарожжа ў восеньскую краіну”, “Дзень экскурсій і падарожжаў”, У гасцях у спартыўнай краіне”, “Восеньскія забавы”. Найбольш запатрабаванымі сталі такія мерапрыемствы як віктарына “Прафесіі – дапамагаць людзям”, акцыя “Мы таленавітыя”, творчая работа “Здароўе – аснова жыцця”, цыкл гульнёвых праграм, і іншыя. У рамках акцыі “Місія – жыць” у лагеры прайшлі наступныя мерапрыемствы: конкурс малюнка “Трэба змалку берагчы сваё здароўе”, у гасцях у казкі “Як мы змагаліся з кепскімі звычкамі”, творчая работа “Самі пішам вершы-звароты дарослым”, конкурс малюнкаў на асфальце “Пабудуем здаровы свет”, сустрэча-пажаданне “Жадаем адзін аднаму здароўя і поспехаў”.

Гульня – гэта працэс мадэліравання, калі аб’ядноўваюцца зносіны і пазнанне новага, неабходныя чалавеку для яго развіцця. Таму патрэбна было перад пачаткам мерапрыемстваў растлумачыць рабятам важнасць інтэлектуальных мерапрыемстваў, якія дапамогуць ім авалодаць сацыяльнымі навыкамі: працаваць у камандзе і вызначаць сваё месца ў сацыяльнай групе, быць камунікабельнымі і талерантнымі. Абапіраючыся на педагагічныя даследаванні, на анкетныя дадзеныя, выявілі, што большасць дзяцей у лагеры (85 %) з павышанай матывацыяй да творчай інтэлектуальнай дзейнасці. Таму мерапрыемствы праводзіліся, перш за ўсё абапіраючыся на такіх дзяцей і з імкненнем зацікавіць усіх астатніх. Лічым, што паспяхова прайшлі ў лагеры такія мерапрыемствы як гульня-казка “Як мы змагаліся з кепскімі звычкамі”, час творчасці “Я малюю восень”, конкурс чараўнікоў “Парад восеньскіх прыгод”, конкурс малюнкаў на асфальце “Пабудуем здаровы свет”, і інш. Вельмі добра тое, што удзельнічаючы ў такіх мерапрыемствах, рабяты набываюць навыкі знатака, развіваюць эрудыцыю, творчае нестандартнае мышленне. Конкурсныя праграмы цікавыя і запамінальныя, дапамагаюць вучням атрымаць мноства новай інфармацыі, павысіць агульнакультурны ўзровень і праявіць лідэрскія якасці. Многія рабяты праявілі сябе ў інтэлектуальнай творчасці па складанню пытанняў і заданняў, а таксама выступілі ў ролі вядучых. Для многіх гульня стала стымулам для самаўдасканалення. А для выхаваценя кожны дзень галоўнай задачай з’яўлялася заўважыць здольнасці кожнага дзіцяці і дапамагчы яму развівацца, абавязкова зацікавіць дзяцей, каб яны адчувалі сябе ў калектыве добра і камфортна. Для правядзення інтэлектуальных гульняў спецыяльнага абсталявання не патрабуецца. Патрэбна толькі дзіцячая зацікаўленасць і жаданне дарослых захапіць дзяцей светам інтэлекту. **Самакіраванне ў лагеры.** На працягу работы ў лагеры рабяты аб’ядноўваюцца ў тры садружнасці добрых чараўнікоў. Кожная садружнасць адказвае за сваё канкрэтнае заданне і мае свой вызначаны колер. Чырвоны – здаравячки, аранжавы – чараўнікі фізічнай культуры, сіні – интэлектуалы -мудрацы. На працягу ўсёй змены ўдзельнікі лагера вучацца арганізоўваць пад кіраўніцтвам выхавацеляў мерапрыемствы рознай накіраванасці. Кожны дзень дзецям прапануецца канкрэтная гульнёвая сітуацыя. У канцы змены падводзяцца вынікі.

**«Лідэры” - «пасіўныя» ў атрадзе.** Сацыяметрычнае даследаванне, педагагічныяназіранні далі магчымасць зрабіць вывад, што ярка выражанымі лідэрамі ў калектыве з’яўляліся  Грыц Ксенія, Губар Мікіта, Дубкова Марыя, Слюнкін Вадзім, Дубкова Дар’я. Астатнія стараліся прыслухоўвацца да іх прапаноў.  Яўна выражаных “пасіўных” рабят ў лагеры не было вызначана, так як усе вучні з задавальненнем удзельнічалі у мерапрыемствах, з’яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі  атраднага самакіравання, самі ініцыіравалі правядзенне інекаторых мерапрыемстваў. **Рэйтынг атрадных мерапрыемстваў.** Наибольш цікавымі для рабят  сталі гульнёвыя танцавальныя забаўляльныя праграмы, спартыўныя гульні, паход аднаго дня, інтэлектуальныя віктарыны.  У атрадзе былі, таксама, вучні, якім падабалася спакойная творчая дзейнасць: маляванне, лепка, размалёўка эскізаў, напісанне творчых работ. Такім дзецям ствараліся адпаведныя ўмовы для такой дзейнасці, арганізоўваліся творчыя індывідуальныя выставы, прэзентацыі работ.

**Педагагічныя  вывады.** У выніку дзейнасці лагернай змены педагагічны калектыў вырашаў задачы па наступных прыярытэтных напрамках:
- стварэнне здароўезберагаючага асяроддзя, накіраванага на фарміраванне адказных адносін да свайго здароўя і здароўя акружаючых;
- творчае і інтэлектуальнае развіццё дзяцей шляхам правядзення разнастайных мерапрыемстваў;
- адказныя адносіны пры правядзенні мерапрыемстваў да  максімальнай бяспекі дзяцей;
- распрацоўка сістэмы аздараўленчай дзейнасці ў рэжыме дня;
- прадугледжванне выканання  псіхолага-педагагічнага аспекту: стварэнне спрыяльных умоў у атрадзе, сацыяльная адаптацыя ў новых умовах часовага дзіцячага калектыву;

**Прыярытэты работы лагера на будучае:**
-пашырэнне сеткі заняткаў па інтарэсах;
-пошук магчымасцей для правядзення ў час работы лагернай змены экскурсій як па свайму рэгіёну, так і за межы раёна, вобласці;
-удасканаленне дыягностыкі і аналітычнай дзейнасці ў выхаваўчай прасторы лагера;
-пашырэнне супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі прадстаўнікамі соцыума, прыцягненне бацькоў для больш эфектыўнага правядзення мерапрыемстваў у час работы лагернай змены.

Начальнік лагера “Здаравячок” Т.В. Гарох

**Раздзел 2. Абгрунтаванне агульных падыходаў, якія ляжаць у аснове выхаваўчай сістэмы лагера “Здаравячок”.**

Забяспечваючы працэс арганізацыі аздараўлення і адпачынку дзяцей у летні перыяд, кіруемся нарматыўнымі прававымі актамі, якія рэгулірують дзейнасць выхаваўча-аздараўленчых установ адукацыі і пытанні аздараўлення дзяцей, указаннымі ў метадычных рэкамендацыях, размешчаных на афіцыйных крыніцах.

Асноўная задача педагагічнага калектыву – стварыць умовы для замацавання здароўя, фарміравання імкнення займацца цікавымі і карыснымі справамі.

У час гутаркі з малодшымі школьнікамі і іх бацькамі было вызначана іх жаданне бачыць работу лагера ва ўстанове адукацыі як стварэнне прасторы для аздараўлення, развіцця мастацкай, тэхнічнай, сацыяльнай творчасці дзіцяці.

У аснову дзейнасці лагера мы палажылі ідэю творчай, групавой і калектыўнай дзейнасці, заснаванай на развіцці ініцыятывы выхаванцаў, іх інтэлектуальных і творчых магчымасцях.

У аздараўленчым лагеры зыходным для нас стала палажэнне аб тым, што канікулы – вольны ад вучобы перыяд жыццядзейнасці – гэта асабісты час дзіцяці, якім ён мае права распараджацца па свайму меркаванню, а яго змест і арганізацыя – актуальная жыццёвая праблема асобы дзіцяці, у вырашэнні якой абавязкова патрэбна дапамога дарослых.

Плануючы работу, абавязкова ўлічвалі ўзроставыя асаблівасці дзяцей ў перыяд з 6 да 10 гадоў, менавіта, іх імкненне быць падобнымі на дарослых, актыўна ўступаць у зносіны з аднагодкамі; вялікая рухальная актыўнасць, ярка выражанае імкненне да спаборніцтва і гульні.

Рэжым дня дапускае абавязковае прабыванне дзяцей на свежым паветры, шырокае правядзенне спартыўных аздараўленчых мерапрыемстваў, арганізацыю рухомых гульняў, і інш.

Разам з тым пры планаванні работы лагера ўлічваўся стан здароўя кожнага дзіцяці. Дзецям на працягу лагернага дня будзе абавязкова адведзены свабодны час для заняткаў відамі дзейнасці, якія найбольш цікавяць кожнага з іх ( прачытванне мастацкіх твораў, маляванне, вольны адпачынак, і інш.)

Галоўнае для педагагічнага калектыва – даць магчымасць кожнаму дзіцяці адчуць сваю значымасць у калектыве, паспрабаваць сябе ў розных карысных справах, а яшчэ фарміраваць у сабе праз гульню ўменне паважаць акружаючых, прыслухоўвацца да думак іншых, вучыцца суперажываць акружаючым.

**Мэта работы зімовай лагернай змены:** стварыць аптымальныя ўмовы, якія забяспечаць паўнацэнны адпачынак, захаванне бяспекі жыцця дзяцей, іх аздараўленне і творчае развіццё.

**Задачы:**

- забеспячэнне адзінства працэсаў захавання і замацавання здароўя дзяцей, іх творчага і інтэлектуальнага развіцця;
- прымяненне ў рабоце лагернай змены інавацыйных форм і метадаў аздараўлення і творчага развіцця дзяцей;
- стварэнне ўмоў для праяўлення індывідуальнасці кожнага дзіцяці, яго творчага патэнцыялу;
- удасканаленне рэсурснага забеспячэння дзейнасці лагернай змены

**Раздзел 3.ПЛАН РАБОТЫ ЛАГЕРА «ЗДАРАВЯЧОК» ПРЫ ДУА «ТУРЭЦКІ ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫ КОМПЛЕКС ДЗІЦЯЧЫ САД-СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА».**

**ДЗЁННАЯ АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ ЗМЕНА ПРАЦУЕ шэсць каляндарных дзён – 01.11, 02.11, 04.11, 05.11, 06.11, 08.11**

| Дата/тэма дня | Раніца, першая палова дня | Другая палова дня | Справы цыклу “Падзелімся цяплом сваёй душы” |
|---|---|---|---|
| 01.11.2019<br>«Восеньская лагерная змена – непаўторная пара новых уражанняў і адкрыццяў» | 1. Фізкультурная зарадка “Восеньская неспадзяванка”<br>2. Спартыўныя восеньскія гульні | Завочная экскурсія “Па чароўных сцяжынках восені” (сумесна з кінавідэапрадпры-емствам | **Акцыя “Помнікі” (Да Дня 75-годдзя Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі”** |
| **02.11.2019 "Чароўны свет роднай зямлі"(У рамках Года малой радзімы)** | Сустрэча-сюрпрыз "Цікавы восеньскі дзень"<br>Інтэрактыўная віктарына “Такі цікавы родны край” | Творчая работа “Мы малюем восень” | Душэўная сустрэча “Калейдаскоп нашых добрых спраў” |
| 04.11.2019<br>Гульні для душы і для добрых спраў | Гульня-падарожжа "Па сцяжынках восені"<br>Мініэкскурсія “Восеньскі лес” | Творчы конкурс малюнкаў івершаў "Прыгажосць восеньскага свету" | Акцыя “Восеньская ўсмешка” |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 05.11.2019<br>**“Цуды маёй роднай зямлі”**<br>**(у рамках акцыі “Збяры Беларусь у сваім сэрцы”)** | Фізкультурная размінка “Восеньскія здаравячкі”<br>Экскурсія “Па сцяжынках роднай зямлі” | Творчая справаздача аб экскурсіі ў малюнках | Аперацыя “Добрае слова” |
| 06.11.2019<br>**“Па знакамітых мясцінах Беларусі” (у рамках Года малой радзімы)** | Экскурсія ў г. Навагрудак | Творчая справаздача аб экскурсіі | Конкурс “Нашы таленты – нашай роднай зямлі” |
| 08.11.2019<br>Цудоўныя прафесіі жыцця | Віктарына "Прафесіі - дапамагаць людзям"<br>Экскурсія на прадпрыемствы сацыяльнага абслугоўвання аграгарадка | Творчая размінка<br>“Мы малюем цудоўны свет” | Акцыя “Добрае слова старэйшаму сябру” |

План складзены начальнікам лагера Т.В. Гарох

## Раздзел 4. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне

Для якаснай работы лагера створана адапаведная матэрыльна-тэхнічная база:

- Метадычная бібліятэка для педагогаў-выхавацеляў.
- Бібліятэка дзіцячай мастацкай літаратуры.
- Актавая зала, дзе праводзяцца масавыя мерапрыемствы.
- Гульнятэка, якая ўключае ў сабе разнастайныя настольныя і рухомыя гульні навучальнага і развіваючага характару, якія актыўна выкарыстоўваюцца для арганізауыі дасуга дзяцей.
- Спартыўнае абсталяванне, спартыўная зала.
- Раздатачны матэрыял: табліцы, малюнкі, фішкі для правядзення гульняў.
- Музыка, ноты, вершы.
- Фотаілюстрацыі.
- Сцэнарыі мерапрыемстваў.

### Метадычнае забеспячэнне

- Метадычная бібліятэка для педагогаў-выхавацеляў.
- Зборнік метадычных рэкамендацый
- Адукацыйная праграма.
- Інструктыўна-метадычнае пісьмо "Аб мерах па ўдасканаленню работы выхаваўча-аздараўленчых устаноў адукацыі".
- Канцэпцыя дзіцячага адпачынку і аздараўлення.
- Метадычныя рэкамендацыі у дапамогу арганізатарам адпачынку.
- Педагагічны дзённік

### Кадравае забеспячэнне

Начальнік лагера: намеснік дырэктара  па выхаваўчай рабоце Т.В. Гарох;

Намеснік дырэктара лагера – педагог-арганізатар  Ракач Святлана Васільеўна;

Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне работы змены – педагог-псіхолаг Факеева Ю.С.;

Выхавацелі: настаўнікі пачатковых класаў  Лазун І.В,  Самец Т.Дз..,
Дзеяновіч Н.В.,  выхавацель ГПД Сас Л.С.,

Кіраўнік фізічнага выхавання – настаўнік фізічнай культуры і здароўя  Г.У. Дрык